*УДК 378.6:37:373.2.091.12*

# АКСІЯЛАГІЧНЫЯ АСНОВЫ ПАДРЫХТОЎКІ ПЕДАГАГІЧНЫХ РАБОТНІКАЎ ДА НАЦЫЯНАЛЬНА-МОЎНАЙ АДУКАЦЫІ ДЗЯЦЕЙ ДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ

**М. Э. Труханovіч**

*Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Акадэмія паслядыпломнай адукацыі», вул. Някрасава, 20, 220040, г.°Мінск, Беларусь, marie29a@yandex.ru*

У артыкуле ўзнімаецца праблема падрыхтоўкі педагагічных работнікаў да нацыянальна-моўнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту. Апісваюцца аксіялагічныя асновы фарміравання матывацыйна-каштоўнаснага стаўлення педагогаў да нацыянальна-моўнай адукацыі як асноўнай умовы забеспячэння якасці дзейнасці. Паказваецца асаблівая роля педагагічных работнікаў у маўленчым і лінгвістычным развіцці дзяцей дашкольнага ўзросту ва ўмовах білінгвальнай адукацыі.

***Ключавыя словы***: дашкольная адукацыя; нацыянальна-моўная адукацыя; падрыхтоўка; педагагічныя работнікі.

# AXIOLOGICAL FOUNDATIONS OF TEACHER TRAINING TO THE NATIONAL LANGUAGE EDUCATION OF PRESCHOOL CHILDREN

**M. E. Trukhanovich**

*State educational institution «Academy of Postgraduate Education», Nekrasov St., 20, 220040, Minsk, Belarus, marie29a@yandex.ru*

The article raises the problem of training teachers for national language education. The article describes the axiological foundations of the formation of the motivational and value attitude of teachers to national language education as the main condition for ensuring the quality of activity. The special role of the teaching staff in the language development of preschoolers in the context of bilingual education is shown.

***Key words:*** national language education; preschool education; teaching staff; training.

Дашкольная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляецца з улікам замацаванага ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь дзяржаўнага двухмоўя і накіравана на стварэнне ўмоў для асваення дзецьмі ранняга і дашкольнага ўзросту беларускай і рускай мовы. Такім чынам, на ўзроўні дашкольнай адукацыі ажыццяўляецца паўнавартасная білінгвальная адукацыі. Кампанентам білінгвальнай адукацыі, накіраваным на засваенне падрастаючым пакаленнем беларускай мовы, як часткі нацыянальнай

культуры, з’яўляецца нацыянальна-моўная адукацыя. Нацыянальна-моўная адукацыя, як працэс навучання і выхавання, накіраваны на асваенне выхаванцамі беларускай мовы, ажыццяўляецца у групах з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання адпаведна патрабаванням адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі. Рэалізацыя задач нацыянальна-моўнай адукацыі патрабуе ад педагагічных работнікаў наяўнасці пэўных кампетэнцый (лінгвістычнай, лінгвадыдактычнай, камунікатыўнай, этнакультуранай), якія даюць магчымасць дабівацца якаснага маўленчага і лінгвістычнага развіцця дзяцей ва ўмовах блізкароднаснага двухмоўя. Разам з тым, для ажыццяўлення адзначанай дзейнасці кожны педагагічны работнік павінен не толькі ведаць беларускую мову, але і мець матывацыйна-каштоўнасную накіраванасць на нацыянальна-моўную адукацыю, асновай якой з’яўляецца ўсведамленне нацыянальнай мовы як уласнай і грамадска значнай каштоўнасці, крыніцы featureнабаковага развіцця дзяцей ранняга і дашкольнага ўзросту. На думку вучоных (С. С. Кашлеў, А. А. Рэан, В. А. Сласценін і інш.) менавіта матывацыйна-каштоўнаснае стаўленне да прафесійнай дзейнасці забяспечвае актыўную пазіцыю па яе ажыццяўленні, садзейнічае пастаяннаму развіццю кампетэнцый, неабходных для яе якаснай рэалізацыі. Адсюль вынікае, што на сучасным этапе развіцця білінгвальнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь у рознаўзроўневай сістэме падрыхтоўкі, перападрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі і метадычнага суправаджэння ва УДА неабходна фарміраваць у педагагічных работнікаў дашкольнай адукацыі ўяўленні аб ролі, якую мова, як неад’емная частка нацыянальнай самасвядомасці народа, адыгрывае ў працэсах сацыялізацыі асобы. У працэсе навучання трэба паказваць каштоўнасць нацыянальнай мовы як эфектыўнага сродку патрыятычнага выхавання дзяцей, акцэнтуючы ўвагу на тым, што менавіта праз родную мову дзіця далучаецца да традыцый беларускага народа, пазнае гісторыю. Важным уяўляецца азнаямленне педагагічных работнікаў з даследаваннямі вучоных аб тым, што засваенне асобай нацыянальнай мовы стварае асаблівы псіхалагічны камфорт, захоўвае сувязь з папярэднімі пакаленнямі, забяспечвае супадзенне ментальнасці асобы і этнасу. Напрыклад, В. А.°Маслава адзначае, што чалавек толькі тады становіцца чалавекам, калі ён з дзяцінства засвойвае мову і разам з ім культуру свайго народа. Усе тонкасці культуры народа адлюстроўваюцца ў яго мове, якая спецыфічная і ўнікальная, бо па-рознаму фіксуе ў сабе свет і чалавека ў ім [1, с. 2].

Падмуркам фарміравання каштоўнаснага стаўлення педагагічных работнікаў да нацыянальна-моўнай адукацыі дзяцей можа стаць азнаямленне іх з даследаваннямі вучоных у галіне маўленчага і лінгвістычнага развіцця дзяцей ранняга і дашкольнага ўзросту ва ўмовах двухмоўя, іх

вынікамі. Напрыклад, Дз. М. Дубініна і Н. С. Старжынская пастаянна ўзнімаюць пытанні неабходнасці нацыянальна-моўнай адукацыі на ўзроўні дашкольнай адукацыі, паказваюць каштоўнасць беларускай мовы, як інструмента фарміравання нацыянальна-моўнай культуры, падкрэсліваючы яе ролю ў прыцягненні падрастаючага пакалення да нацыянальных каштоўнасцей народа [2; 3; 4]. Т. У. Паліева звяртае ўвагу на тое, што нацыянальная мова выступае эфектыўным сродкам выхавання дзяцей. Вучоны падкрэслівае, што праз родную мову дзіця далучаецца да багатай духоўнай спадчыны сваіх продкаў, спасцігае маральна-этычныя ідэалы народа, што спрыяе фармаванню духоўных якасцяў асобы, якія адпавядаюць менталітэту нацыі. Авалоданне нацыянальнай мовай садзейнічае нацыянальнай ідэнтыфікацыі дзяцей, на аснове якой фарміруецца нацыянальная самасвядомасць [5, с. 89].

У працэсе навучання важна падкрэсліваць, што нацыянальна-моўную адукацыю можна ажыццяўляць толькі з улікам існуючага дзяржаўнага білінгвізму і актуальнай сацыялінгвістычнай сітуацыі, у якой для большай часткі насельніцтва родная мова ў разуменні роднай мовы як першай на якой дзіця пачынае размаўляць, з'яўляецца руская. Разам з тым, неабходна звяртаць увагу педагагічных работнікаў на тое, што нават тады, калі мова нацыянальнай прыналежнасці не з'яўляецца для дзіцяці асноўнай функцыянальнай мовай, яе выключэнне з сістэмы адукацыі негатыўна адбіваецца на працэсе фарміравання асобы.

Не менш важна фарміраваць у педагагічных работнікаў каштоўнаснае стаўленне да білінгвальнай адукацыі, якая дазваляе дзецям развівацца ў дыялогу блізкароднасных культур, асвойваючы і засвойваючы лепшае ад кожнай, спрыяць асэнсаванню педагагічнымі работнікамі ўсіх пераваг наяўнасці дзвюх моў у адукацыйнай сістэме і ўсвядоміць важнасць сваёй уласнай прафесійнай дзейнасці ў гэтым працэсе. Для гэтага неабходна знаёміць педагагічных работнікаў з актуальнымі даследаваннямі (G. Dalgalian, F. Grosjean, S. Flynn, Т. У. Чарнігаўская і інш.) аб уплыве білінгвальнай адукацыі на інтэлектуальнае развіццё дзяцей ранняга і дашкольнага ўзросту, якія сведчаць аб больш актыўным развіцці ў білінгваў розных кагнітыўных працэсаў, лепшай канцэнтрацыі ўвагі (што абумоўлена пастаяннай трэніроўкай выбару правільнага слова на адпаведнай мове ў білінгвальнай камунікатыўнай прасторы), крэатыўнасці, камунікабельнасці, фарміраванні схільнасці да далейшага вывучэння іншых моў і г. д. Вызначаны факт абумоўлівае неабходнасць засваення дзецьмі ранняга і дашкольнага ўзросту лінгвакультурнай спадчыны на парытэтных падставах, што дазволіць, не страціўшы ўсё, тое пазітыўнае, што прыўнесла руская культура, захаваць спецыфічную самабытнасць, уласцівую толькі беларускаму народу, якая ўключае і асаблівы спосаб

пазнання рэчаіснасці, абумоўлены асаблівасцямі менталітэту. Вызначаныя веды стануць стымулам для педагагічных работнікаў да стварэння ўмоў, якія прадугледжваюць парытэтнае выкарыстанне рускай і беларускай мовы ў сістэме адукацыі, стварэнне двухмоўнай камунікатыўнай прасторы ва ўстанове дашкольнай адукацыі.

Важна фарміраваць у педагагічных работнікаў уяўленні аб тым, што адным з напрамкаў сучаснай методыкі навучання беларускай мове (нароўні з традыцыйнымі сістэмна-функцыянальным і камунікатыўна-дзейнасным) з’яўляецца лінгвакультуралагічны падыход, звязаны з усведамленнем роднай мовы як сродку пазнання нацыянальнай і сусветнай культур, як феномена, які адлюстроўвае праявы культуры. У аснове названага падыходу ляжыць формула «нацыянальная мова + культура», якая ў выніку лінгвістычных, псіхалінгвістычных і лінгвадыдактычных даследаванняў дзесяцігоддзяў трансфармавалася ў пастулат «культура праз мову і мову праз культуру», або «прысваенне фактаў культуры ў працэсе выкарыстання мовы і авалоданне мовай на аснове прысваення фактаў культуры» [6, с. 359].

Такім чынам, працэс падрыхтоўкі педагагічных работнікаў да нацыянальна-моўнай адукацыі дзяцей ранняга і дашкольнага ўзросту неабходна будаваць на фарміраванні ўсведамлення аб тым, што маўленчае і лінгвістычнае развіццё дзяцей, авалоданне багаццямі нацыянальнай мовы складае адзін з асноўных элементаў фарміравання асобы, асваення каштоўнасцей нацыянальнай культуры, непасрэдна цесна звязана інтэлектуальным і асобастным развіццём, і адпаведна, з'яўляецца прыярытэтным напрамкам у адукацыі дзяцей ранняга і дашкольнага ўзросту ў сітуацыі блізкароднаснага білінгвізму.

Ва ўмовах актуальнай сацыялінгвістычнай сітуацыі, як правіла, менавіта педагагічныя работнікі з’яўляюцца для дзяцей ранняга і дашкольнага ўзросту «праваднікамі» у свет беларускай мовы. Таму менавіта ад педагагічных работнікаў, іх матывацыйна-каштоўнасных адносін да нацыянальна-моўнай адукацыі ў значнай ступені залежыць магчымасць дасягнення мэты дашкольнай адукацыі па фарміраванні ў дзяцей устойлівай цікавасці і станоўчых адносін да нацыянальнай мовы, жаданне авалодаць ёю. Менавіта гэты факт абумоўлівае неабходнасць мэтанакіраванай падрыхтоўкі педагагічных работнікаў да нацыянальна-моўнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту і, перш за ўсё, фарміраванне адпаведнага матывацыйна-каштоўнаснага стаўлення да нацыянальнай мовы як сродку рознабаковага развіцця. У працэсе падрыхтоўкі педагагічных работнікаў да нацыянальна-моўнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту неабходна забяспечыць пераемнасць і комплекснасць

гэтай дзейнасці на ўсіх узроўнях бесперапыннай адукацыі, уключаючы метадычнае суправаджэнне ва УДА, на аснове аксіялагічнага падыходу.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. *Маслова В. А.* Лингвокультурология : учеб. пособие. М. : Изд. центр Academia, 2001.

2. *Дубинина Д. Н.* Родной язык как средство этнокультурного воспитания детей дошкольного возраста // Гуманизация обучающее-воспитательного процесса: сб. науч. раб. Спецвыпуск 15. / Донбасский гос. пед. ун-т. Славянск, 2015. С.186–197.

3. *Старжынская Н. С.* Национально-языковая культура как содержание языкового образования дошкольников // Bildungsmodelle und Lehrwerke für bilinguale Kinder Hrsg. / Elena Plaksina Verlag. Berlin, 2015. Band 8. P. 46–51.

4. *Старжынская Н. С.* Сучасныя падыходы да нацыянальна-моўнай адукацыі дзяцей дашкольнага ўзросту // Пралеска. 2016. № 10. С. 3–8

5. *Палиева Т. В.* Развитие дошкольного образования Беларуси в условиях билингвизма во второй половине XX века: пособие. Мозырь : УО МГПУ имени И. П. Шамякина, 2008.

6. *Зеленко О. В.* Содержание образования по белорусскому языку, обеспечивающее формирование лингвокультурологической компетенции // Мова і культура / Киевский нац. ун-т им. Т. Шевченко, Изд. дом Д. Бураго. Киев, 2009. Вып. 11. С. 358–362.